верш “Хлопчык і летчык”. Можна завучыць першыя 3 слупкі на памяць.




**4. Якія пытанні можна задаць дзецям?**

- Ці спадабалася экскурсія?
- Пра якога паэта вам сёння расказалі?
- Дык хто такі Янка Купала?
- Якая зала больш за ўсё запомнілася?
- Які экспанат больш запомніўся?

**5. Можна пагуляць у гульні ў зале “Беларуская хата”**

**“Адгадай прадмет”**

- Як называўся станок на якім ткалі?
- Як называўся прадмет, на якім пралі пражу?
- Як называлі скрыню, дзе ляжала адзенне?
- Якімі лыжкамі елі?
- Чым аралі зямлю?
- Як называўся ложак для маленькіх дзяцей?

**6. Маляванне дзяцей на аснове ўбачанага**

Заданне 1. Намаляваць ілюстрацыю да верша “Хлопчык і лётчык”.

Заданне 2. Намаляваць прадмет з беларускай хаткі, які больш за ўсё запомніўся.

*Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Яхімоўшчынскі дзіцячы сад Маладзечанскага раёна”*

## МАРШРУТ
## выхаднога дня

# “Экскурсія ў філіял музея Янкі Купалы”



*Прапанаваны маршрут створаны для выхаванцаў і іх бацькоў* для таго, каб
- фарміраваць у іх звесткі аб жыцці і творчасці беларускага паэта і пісьменніка Янкі Купалы;
- развіваць звесткі аб гісторыі жыцця сваёй малой радзімы, свайго народу (асаблівасці быту, працы, культуры, традыцый);
- выхоўваць інтарэс да навакольнага свету, любоў да роднага краю.

*Маршрут прадназначаны для дашкольнікаў 4 – 7 год.*

Аб'ект наведвання знаходзіцца ля цэнтральнай сядзібы аграгарадка Яхімоўшчына.



*Працяг экскурсіі:* 1,5 гадзін.

*Цана білета:* дзіцячы – 2 рублі, дарослы – 5 рублёў.

**Змест экскурсіі**

**1.**Перш, чым пачаць экскурсію, прапануем нагадаць **правілы паводзін у музеі**




**2. Экскурсія па залах музея.**

Расказ экскурсавода аб гісторыі стварэння музея, аб экспанатах залаў.

У двух пакоях філіяла музея размяшчаюцца экспазіцыйныя залы, а трэці пакой-кабінет, дзе жыў Я.Купала, — мемарыяльны. Тут усё захавалася ў тым выглядзе, як было ў пачатку 20 стагоддзя: пісьмовы стол, побач венскае крэсла, этажэрка з кнігамі, камод, дзе зберагаўся ўвесць скарб маладога чалавека.

**2. Наведванне залы "Беларуская хата". Знаёмства з прадметамі быту і працы беларусаў.**





Пазнаёміць дзяцей з прадметамі быту і працы і іх назвамі: ткацкі станок (кросны), калаўрот, куфар, палатно, калыска, цымбалы, гуслі, драўляныя лыжкі і міскі, з якіх елі людзі, плуг драўляны, збанкі, самавар, розны посуд, вышыванкі, беларускае нацыянальнае адзенне і г.д.

**3. Што прачытаць дзецям?**

Вершы Я Купалы " Воля", "Гэта крык, што жыве Беларусь" (зборнік "Жалейка"), а таксама верш